| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:<br>1) вымыць (***як***) ***след***;<br>2) памераць (***у***) ***абхват***;<br>3) (***калі***) ***нікалі*** прыязджаць;<br>4) пакласці (***на***) ***відавоку***;<br>5) ісці (***па***) ***малу***.<br><br>**Адказ:** 4,5 | 1) *вымыць **як след*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне слоў ***як след*** пішацца асобна;<br>2) *памераць **у абхват*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка, які пачынаецца з галоснага, з прыназоўнікам ***у*** пішацца асобна;<br>3) ***калі-нікалі*** *прыязджаць* → складанае прыслоўе, утворанае паўтарэннем таго самага слова (з далучэннем прыстаўкі), пішацца праз злучок;<br>4) *пакласці **навідавоку*** → прыслоўе, утворанае ад назоўніка, які ў сучаснай беларускай мове самастойна не ўжываецца, пішацца разам;<br>5) *ісці **памалу*** → прыслоўе, утворанае ад прыметніка ***малы*** пры дапамозе прыстаўкі ***па-*** і суфікса ***-у***, пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 27–30.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 19, 43; практ. 344 |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх часціцу ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:<br>1) (***не***) ***аслабная*** ўвага;<br>2) (***не***) ***ацэненая*** мастаком карціна;<br>3) (***не***) ***дзе*** знайсці;<br>4) (***не***) ***шкада*** добрых слоў;<br>5) (***не***) ***паклеіўшы*** памяшкання.<br><br>**Адказ:** 2,4,5 | 1) ***неаслабная*** *ўвага* → ***не-*** – прыстаўка, без якой прыметнік ***неаслабная*** не ўжываецца;<br>2) ***не ацэненая*** *мастаком карціна* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім ёсць залежнае слова ***мастаком***, пішацца асобна;<br>3) ***недзе*** *знайсці* → ***не*** ў неазначальным прыслоўі – прыстаўка (пішацца разам);<br>4) ***не шкада*** *добрых слоў* → ***не*** са словам ***шкада*** пішацца асобна;<br>5) ***не паклеіўшы*** *памяшкання* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 42.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 12, 15, 26, 47.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 48 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску | 1) *Калі хочаш убачыць плады, **не** зрывай* | Марфалогія і | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |



УДАКБ

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| ўжываецца часціца ***ні***:<br>1) Калі хочаш убачыць плады, __ зрывай кветак.<br>2) Вочы матулі, з якімі б __ параўноўвалі іх, самыя чароўныя.<br>3) Цэлы тыдзень няма __ сняжынкі.<br>4) Я __ раз па сцежках лугавых хадзіла і на рамонках белых варажыла.<br>5) Хто ж __ марыць марознай зімой апынуцца ў сонечным леце!<br><br>**Адказ:** 2,3 | *кветак.* → для надання адмоўнага значэння галоўнай частцы сказа ***не*** *зрывай кветак* пры дзеяслове-выказніку ўжываецца часціца ***не***;<br>2) *Вочы матулі, з якімі б* ***ні*** *параўноўвалі іх, самыя чароўныя.* → у дадзенай частцы складаназалежнага сказа *з якімі б* ***ні*** *параўноўвалі іх* для ўзмацнення сцвярджэння ўжываецца часціца ***ні***;<br>3) *Цэлы тыдзень няма* ***ні*** *сняжынкі.* → для ўзмацнення адмаўлення, якое выражана словам ***няма***, ужываецца часціца ***ні***; часціца стаіць пры назоўніку ***сняжынкі*** ў форме роднага склону;<br>4) *Я* ***не*** *раз па сцежках лугавых хадзіла і на рамонках белых варажыла.* → у спалучэнні ***не раз*** са значэннем *‘часта’* ўжываецца часціца ***не***;<br>5) *Хто ж* ***не*** *марыць марознай зімой апынуцца ў сонечным леце!* → для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу ўжываецца часціца ***не*** | арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 46.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; практ. 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 47 |
| **А16.** Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) за два кіламетры ад ракí;<br>2) выбачайце нас;<br>3) на карысць дзецям;<br>4) падобны да брата;<br>5) тры чыстых сшыткі.<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | 1) *за два кіламетры ад ракí* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя;<br>2) *выбачайце нам* → пры дзеяслове са значэннем ветлівасці ***выбачаць*** займеннік ужываецца ў форме давальнага склону;<br>3) *на карысць дзецям* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя;<br>4) *падобны да брата* → у словазлучэнні з прыметнікам ***падобны*** назоўнік ужываецца ў форме роднага склону з прыназоўнікам ***да***;<br>5) *тры чыстыя сшыткі* → пры лічэбніку ***тры*** назоўнік і залежны ад яго прыметнік ужываюцца ў форме множнага ліку назоўнага склону | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка.<br>Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; практ. 290.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 8; практ. 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9; С. 242–244 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленае (выдзеленыя) слова (словы) – ***азначэнне***:<br>1) Людзі ў нас ***працавітыя***.<br>2) Не толькі дзеці, але і ***дарослыя*** радуюцца цёплым летнім дзянькам.<br>3) Першыя беларускія тэксты, ***напісаныя арабскім пісьмом***, з'явіліся ў сярэдзіне XVI стагоддзя.<br>4) Ландышы, на ***мой*** погляд, самыя прыгожыя кветкі.<br>5) Вучні атрымалі заданне ***вывучыць*** урывак з паэмы.<br><br>**Адказ:** 3,5 | 1) *Людзі ў нас працавітыя.* → прыметнік ***працавітыя*** з'яўляецца іменнай часткай састаўнога іменнага выказніка (дзеяслоў-звязка адсутнічае);<br>2) *Не толькі дзеці, але і дарослыя радуюцца цёплым летнім дзянькам.* → ужыты ў значэнні назоўніка прыметнік ***дарослыя*** адказвае на пытанне *хто?* і з'яўляецца дзейнікам;<br>3) *Першыя беларускія тэксты, напісаныя арабскім пісьмом, з'явіліся ў сярэдзіне XVI стагоддзя.* → дзеепрыметнікавы зварот ***напісаныя арабскім пісьмом*** абазначае прымету прадмета (***тэксты***), адказвае на пытанне *якія?* і з'яўляецца дапасаваным азначэннем;<br>4) *Ландышы, на мой погляд, самыя прыгожыя кветкі.* → словазлучэнне ***на мой погляд*** граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, указвае на крыніцу паведамлення і з'яўляецца пабочным; пабочнае словазлучэнне не з'яўляецца членам сказа;<br>5) *Вучні атрымалі заданне вывучыць урывак з паэмы.* → інфінітыў ***вывучыць*** адносіцца да дапаўнення-назоўніка ***заданне***, адказвае на пытанне *якое?* і з'яўляецца недапасаваным азначэннем | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Дзейнік і выказнік, спосабы іх выражэння. Даданыя члены сказа. Спосабы выражэння даданых членаў сказа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; §§ 13, 14, 16.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 19, 21, 22.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 56.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 51.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 19, 22, 44.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; § 15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |
| **А18.** Адзначце аднасастаўныя сказы: | 1) *У пачатку верасня пахаладала.* → | Сінтаксіс і | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

УЧАНЬ

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 1) У пачатку верасня пахаладала.<br>2) Не спяшайся, восень, з павуціння кужаль працi тонкі.<br>3) Адна галавешка і ў печы не гарыць.<br>4) Веласпорт уключылі ў праграму Алімпіяды ў 1896 годзе.<br>5) Рэкі вясной імклівыя, гаманлівыя.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны безасабовым дзеясловам;<br>2) *Не спяшайся, восень, з павуціння кужаль працi тонкі.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма (зваротак ***восень*** членам сказа не з’яўляецца); выказнік выражаны дзеясловам у форме загаднага ладу 2-й асобы адзіночнага ліку;<br>3) *Адна галавешка і ў печы не гарыць.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны колькасна-іменным спалучэннем у форме назоўнага склону; выказнік выражаны дзеясловам у форме абвеснага ладу цяперашняга часу 3-й асобы адзіночнага ліку;<br>4) *Веласпорт уключылі ў праграму Алімпіяды ў 1896 годзе.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны дзеясловам у форме абвеснага ладу прошлага часу множнага ліку;<br>5) *Рэкі вясной імклівыя, гаманлівыя.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; аднародныя састаўныя іменныя выказнікі выражаны прыметнікамі (дзеяслоў-звязка адсутнічае) | пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Двухсастаўныя сказы.<br>Аднасастаўныя сказы, іх будова | вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 28.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 15–19, 27–31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:<br>1) Грамніцы __ дзень сустрэчы зімы з вясной.<br>2) Для мяне экзамен __ не экзамен, калі няма хвалявання, якое змяняецца светлай радасцю.<br>3) Жырафа, мабыць, __ самая высокая жывёліна.<br>4) Мой брат добры, разумны, а работнік __ пашукаць такога!<br>5) Шчасце __ нібы птушка: упусціўшы, наўрад ці зловіш.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *Грамніцы* **–** *дзень сустрэчы зімы з вясной.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>2) *Для мяне экзамен не экзамен, калі няма хвалявання, якое змяняецца светлай радасцю.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, працяжнік ***не ставіцца***, бо пры выказніку ёсць адмоўная часціца ***не***;<br>3) *Жырафа, мабыць, самая высокая жывёліна.* → паміж дзейнікам і выказнікам, | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 20. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, стаіць пабочнае слова ***мабыць***, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>4) *Мой брат добры, разумны, а работнік* ***–*** *пашукаць такога!* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>5) *Шчасце нібы птушка: упусціўшы, наўрад ці зловіш.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, працяжнік ***не ставіцца***, бо пры выказніку ёсць параўнальны злучнік ***нібы*** | | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 12.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 21 |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:<br>1) Зямля, неба, дрэвы__ ўсё было ўрачыстым, пакуль іграла ў парку скрыпка.<br>2) Прыкметы сведчаць пра багатае ўяўленне нашых продкаў__ і пра паэтычнае ўспрыманне імі свету, і пра жаданне спасцігнуць таямніцы.<br>3) Дубовыя лісты, лісты парэчак__ ды кроп кладуць з гуркамі ў ка́дкі.<br>4) Вільготны__ чэрвеньскі лес прапах грыбамі і чарніцамі.<br>5) Хваляцца не травою__ а сенам.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) *Зямля, неба, дрэвы* ***–*** *усё было ўрачыстым, пакуль іграла ў парку скрыпка.* → ***усё*** – абагульняльнае слова, перад якім пасля аднародных дзейнікаў ставіцца працяжнік;<br>2) *Прыкметы сведчаць пра багатае ўяўленне нашых продкаў****,*** *і пра паэтычнае ўспрыманне імі свету, і пра жаданне спасцігнуць таямніцы.* → коскамі раздзяляюцца аднародныя дапаўненні, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам ***і***;<br>3) *Дубовыя лісты, лісты парэчак ды кроп кладуць з гуркамі ў ка́дкі.* → паміж аднароднымі дапаўненнямі, звязанымі пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***ды*** (=***і***), коска не ставіцца;<br>4) *Вільготны чэрвеньскі лес прапах грыбамі і чарніцамі.* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якасным прыметнікам ***Вільготны*** і адносным прыметнікам ***чэрвеньскі***, коска не ставіцца;<br>5) *Хваляцца не травою****,*** *а сенам.* → паміж аднароднымі дапаўненнямі, звязанымі пры дапамозе супраціўнага злучніка, ставіцца коска | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з абагульняльнымі словамі і без іх) | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; §§ 19, 20.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 26, 27.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37–41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 12; практ. 99, 100, 104 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Збіраюць беларускія азёры ў свае глыбокія каўшы зіхатлівыя__ як іскаркі__ начныя зоры.<br>2) Люблю я кветкі розныя, але найбольш блакітныя__ што неба__ веранічкі.<br>3) Паравоз__ нібыта прастудзіўся: голас ён меў хрыпаты.<br>4) Сівыя валуны сёння выступаюць__ як сведкі мінулых падзей на нашай зямлі.<br>5) Без навукі чалавек__ нібы сляпое кацяня.<br><br>**Адказ:** 1,2 | 1) *Збіраюць беларускія азёры ў свае глыбокія каўшы зіхатлівыя**,** як іскаркі**,** начныя зоры.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***як іскаркі***; ***як*** – параўнальны злучнік;<br>2) *Люблю я кветкі розныя, але найбольш блакітныя**,** што неба**,** веранічкі.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***што неба***; ***што*** – параўнальны злучнік;<br>3) *Паравоз нібыта прастудзіўся: голас ён меў хрыпаты.* → не ставіцца коска паміж дзейнікам ***Паравоз*** і выказнікам ***нібыта прастудзіўся***;<br>4) *Сівыя валуны сёння выступаюць як сведкі мінулых падзей на нашай зямлі.* → не аддзяляецца коскай зварот ***як сведкі мінулых падзей на нашай зямлі***, які мае значэнне *'ў якасці'* (*валуны* і ёсць *сведкі мінулых падзей на нашай зямлі*);<br>5) *Без навукі чалавек нібы сляпое кацяня.* → не ставіцца коска паміж дзейнікам ***чалавек*** і выказнікам ***нібы кацяня*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 52, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:<br>1) Ліса па следзе зайца-беляка бегла__ не азіраючыся.<br>2) Спечаны матуляй__ лёг на беленькі ручнік хлебны каравай.<br>3) На яшчэ халоднай, непрывετнай зямлі цвіў падбел__ першая кветка вясны.<br>4) Жадаючы растлумачыць некаторыя з'явы прыроды__ людзі ў старажытныя часы складалі міфы, якія мы сёння вывучаем з вялікай цікавасцю.<br>5) Выраблены ў XVIII стагоддзі__ глобус знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу і лічыцца першым у свеце планетарыем.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) *Ліса па следзе зайца-беляка бегла не азіраючыся.* → не аддзяляецца коскай выражаная адзіночным дзеепрыслоўем акалічнасць ***не азіраючыся***, якая стаіць у канцы сказа і сваім значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння (адказвае на пытанне *як?*);<br>2) *Спечаны матуляй**,** лёг на беленькі ручнік хлебны каравай.* → аддзяляецца коскай адасобленае дапасаванае азначэнне ***Спечаны матуляй***, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам, стаіць перад паяснёным назоўнікам ***каравай*** і аддзелена ад яго іншымі членамі сказа;<br>3) *На яшчэ халоднай, непрыветнай зямлі цвіў падбел **–** першая кветка вясны.* → знакам прыпынку (коскай ці працяжнікам) | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 16.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46–50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | аддзяляецца адасоблены развіты прыдатак ***першая кветка вясны***, які адносіцца да назоўніка ***падбел*** і стаіць пасля яго;<br>4) *Жадаючы растлумачыць некаторыя з'явы прыроды**,** людзі ў старажытныя часы складалі міфы, якія мы сёння вывучаем з вялікай цікавасцю.* → аддзяляецца коскай адасобленая акалічнасць ***Жадаючы растлумачыць некаторыя з'явы прыроды***, выражаная дзеепрыслоўным зваротам;<br>5) *Выраблены ў XVIII стагоддзі глобус знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу і лічыцца першым у свеце планетарыем.* → не аддзяляецца коскай дапасаванае азначэнне ***Выраблены ў XVIII стагоддзі***, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам, стаіць перад паяснёным назоўнікам ***глобус*** і не мае дадатковага акалічнаснага значэння прычыны ці ўступкі | | |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Сяброў (а іх мне лёс паслаў нямала) я ніколі не дзяліў на блізкіх і на далёкіх.<br>2) Кожны кулік вядома сваё балота хваліць.<br>3) Добрае слова любому, лічу, прыемна пачуць.<br>4) Бабры здольныя праплысці пад вадой, амаль, 800 метраў.<br>5) Герань з'яўляецца пакаёвай раслінай, аднак, яна можа расці і ў садзе.<br><br>**Адказ:** 1,3 | 1) *Сяброў (а іх мне лёс паслаў нямала) я ніколі не дзяліў на блізкіх і на далёкіх.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: сказ ***а іх мне лёс паслаў нямала***, які па сэнсе не звязаны з асноўным зместам сказа, а падаецца як дадатковая заўвага, з'яўляецца ўстаўным; устаўная канструкцыя бярэцца ў дужкі або выдзяляецца з двух бакоў працяжнікамі;<br>2) *Кожны кулік**,** вядома**,** сваё балота хваліць.* → слова ***вядома***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, а ўказвае на большую ступень упэўненасці ў паведамленні, з'яўляецца пабочным; пабочнае слова выдзяляецца коскамі;<br>3) *Добрае слова любому, лічу, прыемна пачуць.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: слова ***лічу***, якое | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, а ўказвае на крыніцу паведамлення, з’яўляецца пабочным; пабочнае слова выдзяляецца коскамі;<br>4) *Бабры здольныя праплысці пад вадой амаль 800 метраў.* → часціца ***амаль*** коскамі не выдзяляецца;<br>5) *Герань з’яўляецца пакаёвай раслінай, аднак яна можа расці і ў садзе.* → пасля супраціўнага злучніка ***аднак***, які звязвае дзве часткі складаназлучанага сказа, коска не ставіцца | | |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць знак прыпынку:<br>1) Усю раніцу то жаўрук звінеў у небе то свістаў на ліпе шпак.<br>2) Хутка павуцінкамі ўсцелецца трава і зменяць бярозкі зялёны ўбор на залаты.<br>3) Вясна-красуня ў бубен ударыць і заспявае светлы гай.<br>4) Якая мяккая сцяжынка ў зялёным лянку і што за возера-дзіва ў альховым вянку!<br>5) Схілілася спелая ніва да самай зямлі і ў кветках паснулі ад спёкі чмялі.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *Усю раніцу то жаўрук звінеў у небе, **то** свістаў на ліпе шпак.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі, звязанымі паўторным размеркавальным злучнікам ***то – то***, ставіцца коска;<br>2) *Хутка павуцінкамі ўсцелецца трава і зменяць бярозкі зялёны ўбор на залаты.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца, бо ў першай частцы ёсць агульная для абедзвюх частак акалічнасць ***Хутка***;<br>3) *Вясна-красуня ў бубен ударыць **–** і заспявае светлы гай.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, звязанымі спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік, бо другая частка сказа змяшчае вынік таго, пра што гаворыцца ў першай;<br>4) *Якая мяккая сцяжынка ў зялёным лянку і што за возера-дзіва ў альховым вянку!* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія маюць клічную інтанацыю, перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца; | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 6–11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 10–14.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 16 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 5) *Схілілася спелая ніва да самай зямлі**,** і ў кветках паснулі ад спёкі чмялі.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** ставіцца коска | | |
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску ***не трэба*** ставіць знак прыпынку:<br>1) Дрэвы не хварэюць там__ дзе селяцца мурашкі.<br>2) Для пісьменніка вельмі важна, каб яго не абдзялялі ўвагай чытачы__ і каб пра яго творчасць не маўчалі крытыкі.<br>3) Зразумела, што__ калі духоўны свет чалавека багаты, то багатай будзе і яго мова.<br>4) Вядома, што Кузьма Чорны пазбягаў у сваіх творах дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў__ якія, на яго думку, мала ўласцівыя беларускай мове.<br>5) Калі з’явіўся бусел у гняздзе__ браўся ўжо на захад дзень.<br><br>**Адказ:** 2,3 | 1) *Дрэвы не хварэюць там**,** дзе селяцца мурашкі.* → складаназалежны сказ, у якім трэба аддзяляць коскай дададзеную частку ***дзе селяцца мурашкі***, што стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***дзе***;<br>2) *Для пісьменніка вельмі важна, каб яго не абдзялялі ўвагай чытачы і каб пра яго творчасць не маўчалі крытыкі.* → складаназалежны сказ з дзвюма дададзенымі часткамі ***каб яго не абдзялялі ўвагай чытачы і каб пра яго творчасць не маўчалі крытыкі***, якія адносяцца ў галоўнай да выказніка ***важна***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *што?* і з’яўляюцца аднароднымі; паміж аднароднымі дададзенымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коску ставіць ***не трэба***;<br>3) *Зразумела, што калі духоўны свет чалавека багаты, то багатай будзе і яго мова.* → складаназалежны сказ з дзвюма дададзенымі часткамі ***што калі духоўны свет чалавека багаты, то багатай будзе і яго мова***, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, коску ставіць ***не трэба***, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то***;<br>4) *Вядома, што Кузьма Чорны пазбягаў у сваіх творах дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў**,** якія, на яго думку, мала ўласцівыя беларускай мове.* → | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 13–21, 23, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 15–24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | складаназалежны сказ з дзвюма дадзенымі часткамі, у якім трэба аддзяліць коскай ад першай дадзенай часткі ***што Кузьма Чорны пазбягаў у сваіх творах дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў*** другую дадзеную ***якія, на яго думку, мала ўласцівыя беларускай мове***, звязаную з першай пры дапамозе злучальнага слова ***якія***;<br>5) *Калі з'явіўся бусел у гняздзе**,** браўся ўжо на захад дзень.* → складаназалежны сказ, у якім трэба аддзяліць коскай дадзеную частку ***Калі з'явіўся бусел у гняздзе***, што стаіць перад галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучніка ***калі*** | | |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е:<br>1) Студзень мяце__ ліпень залье.<br>2) Кінь зярняты ў цёплую раллю__ яны тут жа прарастуць.<br>3) Кот, на думку Валодзькі, меў вялікі недахоп__ ён засынаў, не даслухаўшы казак хлопчыка.<br>4) Чытаючы вершы Уладзіміра Караткевіча, разумею__ ма́е свой колер і смак у пісьменніка кожнае слова.<br>5) Жаваранак нездарма ма́е шэры колер__ такая афарбоўка добра маскіруе птушку на лузе і ў полі.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *Студзень мяце* **–** *ліпень залье.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой частцы; у пачатку першай часткі можна паставіць злучнік ***калі***;<br>2) *Кінь зярняты ў цёплую раллю* **–** *яны тут жа прарастуць.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо другая частка паказвае на вынік таго, пра што гаворыцца ў першай частцы;<br>3) *Кот, на думку Валодзькі, меў вялікі недахоп**:** ён засынаў, не даслухаўшы казак хлопчыка.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо другая частка раскрывае, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць словы ***а іменна***;<br>4) *Чытаючы вершы Уладзіміра Караткевіча, разумею**:** ма́е свой колер і смак у пісьменніка кожнае слова.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 26–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 25–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 18 |



УАЦРВ

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ставіцца двукроп'е, бо другая частка дапаўняе першую, развіваючы дзеяслоўвыказнік ***разумею***; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>5) *Жаваранак нездарма ма́е шэры колер**:** такая афарбоўка добра маскіруе птушку на лузе і ў полі.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо ў другой частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што*** | | |
| **А27.** Адзначце варыянт адказу, дзе ўказана лічба, на месцы якой у сказе ***не трэба*** ставіць знак прыпынку:<br><br>*Вядома*$_1$ *што з сярэдзіны XII стагоддзя ў мастацтве краін Еўропы пачаўся новы перыяд – гатычны*$_2$ *але яго назва ўмоўная, звязаная з памылковым меркаваннем*$_3$ *якое ўпершыню было выказана ў эпоху Адраджэння*$_4$ *і якое заключалася ў наступным*$_5$ *на культуру сярэдневяковых еўрапейскіх дзяржаў аказалі ўплыў плямёны готаў.*<br><br>1) 1;<br>2) 2;<br>3) 3;<br>4) 4;<br>5) 5.<br><br>**Адказ:** 4 | **I** [1)]*Вядома****,*** [2)]*што з сярэдзіны XII стагоддзя ў мастацтве краін Еўропы пачаўся новы перыяд – гатычны****,*** **II** [3)]*але яго назва ўмоўная, звязаная з памылковым меркаваннем****,*** [4)]*якое ўпершыню было выказана ў эпоху Адраджэння і* [5)]*якое заключалася ў наступным****:*** **III** [6)]*на культуру сярэдневяковых еўрапейскіх дзяржаў аказалі ўплыў плямёны готаў.* → лічба, на месцы якой у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак не трэба ставіць знак прыпынку, – **4**:<br>1) у сэнсавай частцы **I** трэба аддзяліць коскай даданую частку **2** ад галоўнай часткі **1**;<br>2) паміж сэнсавымі часткамі **I** і **II** з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***але*** трэба паставіць коску;<br>3) у сэнсавай частцы **II** аднародныя даданыя часткі **4** і **5** трэба аддзяліць коскай ад галоўнай часткі **3**;<br>4) у сэнсавай частцы **II** паміж аднароднымі даданымі часткамі **4** і **5**, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, ***не трэба ставіць знак прыпынку***;<br>5) паміж сэнсавымі часткамі **II** і **III**, якія аб'яднаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі, трэба паставіць двукроп'е, бо частка | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 31, 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 30, 31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | **III** раскрывае, удакладняе змест часткі **II** | | |
| **А28.** Адзначце сцверджанне, якое адпавядае сказу з простай мовай:<br><br>*«Душа не падарожніца, – часта паўтараў дзядуля ўнукам – Дзе б мы ні былі, душой – заўсёды дома».*<br><br>1) простая мова няправільна заключана ў двукоссе;<br>2) у сказе адсутнічае двукроп'е;<br>3) у сказе пастаўлены ўсе неабходныя знакі прыпынку;<br>4) у сказе адсутнічае коска;<br>5) у сказе адсутнічае кропка.<br><br>**Адказ:** 5 | *«Душа не падарожніца, – часта паўтараў дзядуля ўнукам***.** *– Дзе б мы ні былі, душой – заўсёды дома».* → сказу адпавядае сцверджанне пад нумарам **5**:<br>1) сказ з простай мовай, у якім словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы, падзяляючы яе на дзве часткі – закончаныя сказы; пасля слоў аўтара перад працяжнікам трэба паставіць *кропку* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 30.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 35, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |

**Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6**

(1) *Два тыдні запар ішоў дождж.* (2) *Церушыў і церушыў, быццам праз сіта.* (3) *Часам такім непрыветным ветрам цягнула, што аж пальцы дубелі.* (4) *Адчувалася, нібы вось-вось пасыпле зверху снег і ляжа на палі, на* ***сцежкі*** *бліскучым пухам.*

(5) *Раптам халодны дождж перастаў ісці.* (6) *Ды толькі сняжок не пасыпаў – сонейка выбліснула на паўнеба.* (7) *Усё навокал ажыло, павесялела.* (8) *Дні сталі ціхімі, поўнымі мяккай задуменнасці і харáства.* (9) *У паветры зноў паплыло павуціннe.* (10) *Далікатэсныя серабрыстыя валаконцы імкнуліся асесці на зямлю, зачапіцца за платы, галінастыя дрэвы, быльнёг.* (11) *Зямля набыла матава-белы колер, а тонкія валаконцы ўсё ткаліся і ткаліся.* (12) *Асенні блакіт зазіхацеў так, што ў ім, здавалася, хутка пачуецца чароўная песня палявога жаваранка.*

(13) *– Бабіна лета, Андрэевіч, прыйшло, – звярнуўся да сына Андрэй Пятровіч.*

(14) *Ён часта так звяртаўся да хлопчыка, жадаючы* ***засведчыць*** *бацькоўскую любоў і павагу.*

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| (15) – *Нішто жывое, – крыху памаўчаўшы, зноў пачаў размову бацька з сынам, – не траціць цяпер марна гэтых апошніх залатых дзянькоў.* (16) *Хто назапашвае на зіму кармы́, хто спяшаецца як мага лепш уцяпліць* ***сваё*** *жыллё, хто проста набіраецца сіл.* (17) *Але кароткія яны – гэтыя залатыя дзянькі бабінага лета.* (18) *Тыдзень-два – і зноў схаваецца за хмары сонца, пачнуць дзьмуць халодныя вятры, зачасцяць ападкавыя дажджы.* (19) *Пазбудзецца свет пагодлівай утульнасці.* (20) *Пакуль жа пануе ў нас залатая* ***восень****, будзем усхваляць, Андрэевіч, яе прыгажосць!* | | | |
| **А29.** Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>2) тэкст мастацкага стылю;<br>3) тэкст навуковага стылю;<br>4) тэкст гутарковага стылю;<br>5) тэкст афіцыйнага стылю.<br><br>**Адказ:** 2 | тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам **2**: тэкст ***мастацкага стылю***, таму што:<br>1) уяўляе сабой свабоднае, натуральна арганізаванае маўленне, якое характэрна для мастацкіх твораў розных жанраў: *раман*, *аповесць*, *апавяданне*;<br>2) яго галоўная асаблівасць – адзінства рэалізацыі камунікатыўнай і эстэтычнай функцый: словы не толькі перадаюць пэўны змест, але і, з'яўляючыся сродкам фарміравання мастацкіх вобразаў, уздзейнічаюць на думкі і пачуцці чытача;<br>3) эмацыянальнасць, вобразнасць, яркасць тэксту надаюць вобразна-выяўленчыя сродкі: эпітэты (*непрыветным* ветрам, *мяккай* задуменнасці, *серабрыстыя* валаконцы, *чароўная* песня, *залатых* дзянькоў, *пагодлівай* утульнасці); метафары (*паплыло павуцінне*; *валаконцы імкнуліся асесці*); параўнанні (*церушыў, быццам праз сіта*; *снег ляжа … бліскучым пухам*); словы з памяншальна-ласкальным значэннем (*сняжок*, *сонейка*, *валаконцы*, *дзянькоў*); фразеалагізм (*бабіна лета*); сказы з простай мовай (– *Бабіна лета, Андрэевіч, прыйшло, – звярнуўся да сына Андрэй Пятровіч.*) | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 3, 4.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 13, 57.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 10, 11, 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; § 7.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 4–8 |
| **А30.** У адным са сказаў ***5–10*** тэксту знайдзіце лексічную памылку (няправільна ўжытае па значэнні слова). З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў ***5–10***:<br>1) халадзільны;<br>2) ажыццявілася;<br>3) далікатныя;<br>4) ціхмянымі;<br>5) галінавыя.<br><br>**Адказ:** 3 | 1) *далікатныя* → у ***10-м*** сказе тэксту замест слова ***далікатэсныя*** (*далікатэсны* – ‘які мае адносіны да рэдкай, прыемнай на смак ежы’) павінна быць ужыта слова ***далікатныя*** (*далікатны* – ‘кволы, мяккі, прыемны навобмацак’): *далікатныя валаконцы* | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Паронімы | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; С. 38.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |
| **В1.** Знайдзіце ў ***18-м*** сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў ***18-м*** сказе.<br><br>**Адказ:** ападкавыя | 1) *ападкавыя* → ужытае ў ***18-м*** сказе слова ***дажджы*** мае значэнне ‘*атмасферныя ападкі ў выглядзе кропелек вады*’, таму слова ***ападкавыя*** ў прапанаваным сказе збыткоўнае | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 1.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 2 |
| **В2.** Знайдзіце ў ***3-м*** сказе тэксту часціцу і запішыце яе.<br><br>**Адказ:** аж | 1) *аж* → у ***3-м*** сказе тэксту ўжыта ўзмацняльная часціца ***аж*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Службовыя часціны мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 43, 44.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа |



УА"ВІКВ"

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 45 |
| **В3.** Запішыце падкрэслены ў ***4-м*** сказе тэксту назоўнік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** сцежцы | 1) *сцежцы* → назоўнік 1-га скланення ***сце́жка*** з асновай на зычны гук [***к***] у форме давальнага склону адзіночнага ліку мае канчатак **-*ы***, бо націск падае на аснову; пры скланенні гук [***к***] чаргуецца з гукам [***ц***] | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Назоўнікі 1-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 17.<br>**.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 29 |
| **В4.** Ад назоўніка, падкрэсленага ў ***20-м*** сказе тэксту, утварыце прыметнік пры дапамозе суфікса **-*н*-**. Запішыце гэты прыметнік у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** асенні | 1) *асенні* → пры дапамозе суфікса **-*н*-** ад назоўніка ***восень*** утвараецца прыметнік ***асенні*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Утварэнне і правапіс прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37, 40.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 25 |
| **В5.** Запішыце падкрэслены ў ***16-м*** сказе тэксту займеннік у форме роднага склону адзіночнага ліку ніякага роду.<br><br>**Адказ:** свайго | 1) *свайго* → прыналежны займеннік ***сваё*** ў родным склоне адзіночнага ліку ніякага роду мае форму ***свайго*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне займеннікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 50, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 36 |

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| **В6.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***14-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** засведчаны | 1) *засведчаны* → ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання ***засведчыць*** з дапамогай суфікса ***-ан-*** утвараецца поўны дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу ***засведчаны*** (форма назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду – ***засведчаны***) | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 8–10.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 40 |
| **В7.** З двух прапанаваных у дужках слоў вызначце тое, што адпавядае сэнсу сказа. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно павінна быць ужыта ў сказе:<br><br>*Увесну, калі зацвітае багун, балота становіцца незвычайным: перад вачамі рассцілаецца дыван з бела-ружовых кветак, а (наваколле, акружнасць) напаўняецца водарам.*<br><br>**Адказ:** наваколле | 1) *наваколле* → слова ***наваколле*** мае значэнне ‘*мясцовасць, якая прылягае, прымыкае да чаго-небудзь*’ і адпавядае сэнсу сказа: *Увесну, калі зацвітае багун, балота становіцца незвычайным: перад вачамі рассцілаецца дыван з бела-ружовых кветак, а наваколле напаўняецца водарам.*;<br>2) слова ***акружнасць*** мае значэнне ‘*замкнёная крывая, усе пункты якой роўна аддалены ад цэнтра; лінія вымярэння акруглых паверхняў і прадметаў*’ і сэнсу сказа не адпавядае | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Слова, яго лексічнае значэнне | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 20 |

**В8.** Устанавіце адпаведнасць паміж словамі ў левым слупку і іх характарыстыкамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Вермішэль. | **1.** Слова, у якім адзін мяккі зычны гук. |
| **Б.** Сухенькі. | **2.** Слова, у якім два зацвярдзелыя зычныя гукі. |
| **В.** Малацьбіт. | **3.** Слова, у якім ёсць зычны гук [***дз’***]. |
| **Г.** Слойка. | **4.** Слова, у якім націск падае на другі склад. |
| | **5.** Слова, у якім усе зычныя гукі цвёрдыя. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А2Б4В3Г1 | 1) *вермішэ́ль* – слова, у якім два зацвярдзелыя зычныя гукі: [*в’эрм’ішэл’*];<br>2) *сухе́нькі* – слова, у якім націск падае на другі | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | склад;<br>3) *малацьбі́т* – слова, у якім ёсць зычны гук [***дз’***]: [*мала**дз’**б’іт*];<br>4) *сло́йка* – слова, у якім адзін мяккі зычны гук: [*сло**й**ка*] | Культура маўлення. Вымаўленне зычных гукаў, спалучэнняў зычных гукаў. Склад і націск | беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 30.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 1, 3, 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; §§ 6, 13–15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; С. 263–267.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 13, 14, 16 |

**В9.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** На галаву вышэй. | **1.** Мае значэнне *‘значна больш, чым мяркуе хто-небудзь’*. |
| **Б.** Бяры вышэй. | **2.** Мае значэнне *‘значна больш вопытны (у параўнанні з кім-небудзь)’*. |
| **В.** Бяры не хачу. | **3.** Па значэнні адпавядае фразеалагізму *без ліку*. |
| **Г.** Светлая галава. | **4.** Па значэнні адпавядае фразеалагізму *галава на плячах*. |
| | **5.** Мае значэнне *‘поўнасцю, цалкам’*. |

УА "РІКВ"

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td>Адказ: А2Б1В3Г4</td><td>1) на галаву вышэй → мае значэнне ‘значна больш вопытны (у параўнанні з кім-небудзь)’;<br>2) бяры вышэй → мае значэнне ‘значна больш, чым мяркуе хто-небудзь’;<br>3) бяры не хачу → па значэнні (вельмі многа) адпавядае фразеалагізму без ліку;<br>4) светлая галава → па значэнні (хто-небудзь ясна і лагічна мысліць, разважае) адпавядае фразеалагізму галава на плячах</td><td>Лексіка.<br>Фразеалогія.<br>Культура маўлення. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 22.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 32.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 22</td></tr>
<tr><td colspan="4">В10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><table><tr><td>А. Адгадка.<br>Б. Адкуль-небудзь.<br>В. Бяздомны.<br>Г. Залетась.</td><td>1. Прыставачна-суфіксальны.<br>2. Бяссуфіксны.<br>3. Суфіксальны.<br>4. Постфіксальны.<br>5. Прыставачны.</td></tr></table></td></tr>
<tr><td>Адказ: А3Б4В1Г5</td><td>1) адгадка → слова ўтворана суфіксальным спосабам: адгад/а/-(ць) + суфікс -к-;<br>2) адкуль-небудзь → слова ўтворана постфіксальным спосабам: адкуль- + постфікс -небудзь;<br>3) бяздомны → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: дом- + прыстаўка бяз- і суфікс -н-;<br>4) залетась → слова ўтворана прыставачным спосабам: летась + прыстаўка за-</td><td>Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 31, 32.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 24, 36.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова:</td></tr>
</table>

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
| --- | --- | --- | --- |
| | | | вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 23–25.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 25 |

УА "РІКВ"